*1.Дзеепрыслоўе абазначае:*
а) прымету прадмета;
б) прымету прадмета паводле дзеяння;
в) асноўнае дзеянне прадмета;
г) дадатковае дзеянне прадмета.
*2.Дзеепрыслоўе мае прыметы дзеяслова:*
а) трыванне;
б) час;
в) спражэнне;
г) асобу;
д) лад;
е) зваротнасць/незваротнасць.
*3.Дзеепрыслоўі змяняюцца:*
а) па ліках і склонах;
б) па асобах і ліках;
в) не змяняюцца.
*4.Адзначце ў кожным радзе дзеяслоўных формаў дзеепрыслоўі:*
а) ісці, прыйдзе, ідучы;
б) падымаць, падняты, падымаючы, падыму;
в) супакоіўшыся, супакойся, супакоіцца, супакоены;
г) праполаты, прапалваю, прапалолі, прапалоўшы.
*5.Выберыце правільны адказ:*
а) Дзеянні, якія перадаюцца ў сказе дзеясловам і дзеепрыслоўем, выконваюць розныя асобы ці прадметы;
б) Дзеянні, якія перадаюцца ў сказе дзеясловам і дзеепрыслоўем, выконвае адна і тая ж асоба ці прадмет.
*6.Падкрэсліце дзеясловы, ад якіх утвораны прыведзеныя дзеепрыслоўі:*
а) **апрануўшыся** – апрануць, апрануцца, апранацца, апранаць;
б) **размываючы** – размыць, размываць, размывацца;
в) **задумаўшыся** – задумацца, задумаць, задумвацца.
*7.Адзначце сказы з дзеепрыслоўямі:*
а) Калі прыйшла з работы маці, то ўбачыла поўную хату дзятвы;
б) Але Юлька не слухала маці і, апусціўшыся на падлогу, пачала разглядваць бусляня;
в) Дом быў невялікі, стары, на два паверхі, ашаляваны на другім паверсе дошкамі;
г) Адыходзячы дадому, я браў Міцевы сшыткі з сабою, а назаўтра прыносіў іх у школу;
д) І вось ужо сядзіць на каменьчыку страказа, выпроствае і абсушвае на сонцы згорнутыя перад гэтым крылы.
*8.Адзначце адпаведнасць:*

| | |
|---|---|
| спілаваны | дзеепрыслоўе закончанага трывання |
| спілаваўшы | дзеепрыметнік залежнага стану прошлага часу |
| пілуючы | дзеепрыслоўе зваротнае |

LIVEWORKSHEETS

| | |
|---|---|
| усміхнуўшыся | дзеепрыслоўе незакончанага трывання |

9. Выберыце неабходныя суфіксы учы (ючы), ачы (ячы), ўшы ( шы)
Спілаваць – спілава…..
Спісаць- спіса….
Рабіць- роб…
Касіць – кос…
Браць- бер…
Несці- нес….
Стварыць- ствары…
Ствараць- ствара….

LIVEWORKSHEETS